# АРХЕАЛОГІЯ І ЭТНАГРАФІЯ

А. А. Трусаў (Мінск)

## АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ТУПІЧЭЎСКАГА МАНАСТЫРА Ў г. МСЦІСЛАВЕ

Знакаміты на ўсю Беларусь (і пазней у Расійскай імперыі) мужчынскі Тупічэўскі манастыр быў заснаваны ў 1641 г. на ўсходняй ускраіне г. Мсціслава. Ён паступова разбудоўваўся і ў канцы ХХ ст. складаўся з галоўнай Святадухаўскай, Увядзенскай, Успенскай цэркваў, званіцы з царквой цудатворца Мікалая, манастырскіх і гаспадарчых пабудоў. Спачатку манастыр быў абнесены драўлянай, а з канца ХІХ ст. мураванай агароджай з капліцамі.

Святадухаўская царква (пабудавана ў 1641 г.) — драўляная, на каменным падмурку, крыжова-купальная, мела 5 глаў — адну вялікую і чатыры малыя. Даўжыня і шырыня будынка каля 25 м. Першапачаткова быў абшыты дошкамі. Дах пакрылі гонтай, а ў канцы ХІХ ст. — бляхай. Вакол царквы праходзіла паўзакрытая галерэя на каменных слупах з паясным бар'ерам. Сцены ў другой палове XVII ст. былі распісаны на тэмы Старога і Новага Запаветаў. Роспісы, зробленыя па дрэве, налічвалі 73 кампазіцыі. Найбольш рэалістычнай манерай вылучаліся «Рай», «Стварэнне Евы», «Спакуса Адама». Невядомыя мастакі шырока выкарыстоўвалі ў сваіх размалёўках мясцовыя краявіды, выявы жывёл.

Цёплая царква ў імя Увядзення ў храм Прасвятой Багародзіцы (пабудавана ў 1771 г.) таксама была драўляная, на каменным падмурку, аднакупальная. Даўжыня складала 12 м, шырыня — каля 7 м. У канцы ХІХ ст. царква значна пабольшала, даўжыня стала каля 22 м. Будынак абклалі цэглай і пакрылі бляхай. У інтэр'еры сцены былі атынкаваныя і ўпрыгожаныя арнаментам і роспісам на рэлігійныя сюжэты.

Царква ў імя цудатворца Мікалая (існавала да 1839 г.) знаходзілася ў другім ярусе драўлянай надбрамнай званіцы. Даўжыня яе — каля 9 м, шырыня — каля 8 м. Мела адну галаву, крытую гонтай, двух'ярусны іканастас.

Царква Успення Багародзіцы (пабудавана ў 1891—1895 гг.) — мураваная, узведзена ў псеўдарускім стылі. Была крыта бляхай, мела адну вялікую главу. Над прытворам знаходзілася званіца. У інтэр'еры сцены аздоблены стужкавымі гзымсамі, ляпнінай, распісаны выявамі святых з арнаментамі. Памеры храма 29х18 м. У царкве мелася два іканастасы: у галоўным алтары чатырох'ярусны, разны, з пазалотай, другі — трох'ярусны.

З 1886 г. Тупічэўскі манастыр стаў жаночым. У канцы ХІХ — пачатку ХХ ст. на манастырскім двары існавалі кухня, дом ігуменні, некалькі дамоў для манашак, свіран, вазоўня, стайня, па-за манастырскай агароджай — дом для святара,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Сабор Тупічэўскага манастыра. XIX ст.

вучылішча, амбулаторыя з аптэкай. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы былі ў асноўным драўляныя.

У 20—30-я гг. XX ст. манастыр скасаваны, тут месціўся дзіцячы дом. Манастырскі комплекс не збярогся (загінуў у 50-ыя гады XX ст.), засталіся толькі фрагменты муравана агароджы, брамы і капліц канца XIX ст. Частка тэрыторыі занята будынкамі маслазавода.

Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Тупічэўскага манастыра праводзіліся аўтарам артыкула ў 1984 г. Быў закладзены невялікі раскоп (7 м$^2$) і тры шурфы (12 м$^2$). Таўшчыня культурнага пласта вагалася ад 0,5 да 1,4 м. У паўночнай частцы раскоп знойдзены развал кафлянай печы другой паловы XVII — першай паловы XVIII ст.

Самыя раннія фрагменты непаліванай керамікі на тэрыторыі Тупічэўскага манастыра датуюцца канцом XV — XVI ст. Гэта значыць, што гэтая частка горада была заселена значна раней, чым тут заснавалі манастыр.

Аднак асноўныя знаходкі датычацца існавання манастыра. Гэта розны кухонны і сталовы посуд — гаршкі, патэльні-латкі, збаны, міскі і куфлі. Сустракаюцца фрагменты непаліванай, дымлёнай і паліванай, а таксама распісной керамікі. Было сабрана і шмат фрагментаў шкляных вырабаў — бутэлькі, шкляніцы, стопкі, ваконнае шкло, а таксама вырабы з металу — падковы, трохшыпныя абутковыя падкоўкі і каваныя цвікі. Знойдзены непаліваныя пліткі падлогі, цэгла-пальчатка і тачыльны брусок. Сабрана вялікая колькасць пячной кафлі, паліфаванай, непаліванай і паліхромнай, аздобленай геаметрычным, раслінным і геральдычным арнаментам.

Паліхромныя мсціслаўскія кафлі XVII ст. вырабляліся ў тых жа матрыцах, што і зялёнапаліваныя, і тэракотавыя, пра што сведчыць аднолькавы рэльеф. Яны абпальваліся побач у адным горане, гэта пацвярджаюць плямы зялёнай палівы на румпе. Колькасны спектральны аналіз паліваў, зроблены ў ленінградскім аддзяленні

Інстытута археалогіі АН СССР У. А. Галібіным, паказаў, што абпалу кафлі пакрывалі слоем свінцова-алавянай палівы, дзе $SiO_2$ і PbO — шклоўтваральныя элементы, а двухвокіс волава выконвае ролю глушыцеля. Мсціслаўскія майстры выкарыстоўвалі традыцыйныя фарбавальнікі: $Fe_2O_3$ (жоўты), CuO (зялёны), $SnO_2$ (белы, глушыцель), CoO (сіні), MgO (фіялетавы, цёмна-карычневы).



Кафля з Тупічэўскага манастыра

Мсціслаўскія ганчары рабілі не толькі кухонны і сталовы посуд, але і ведалі сакрэты вырабу шыкоўнай кафлі, у тым ліку і паліхромнай. Адным з вядомых беларускіх кафляроў у XVII ст. быў Сцяпан Іваноў (па мянушцы Палубес). З 1654 г. ён працаваў у Маскве, дзе разам са сваёй арцеллю аздобіў паліхромнай кафляй царкву Рыгора Новакесарыйскага і сабор Пакрова ў Ізмайлаве. Найбольш значны яго твор — маёлікавыя рэльефы апосталаў для царквы Успення ў Ганчарах — захоўваецца зараз у Музеі народнага мастацтва ў Каломенскім.

Надзвычай цікавай з'явай у мсціслаўскім кафлярстве канца XVI – XVII ст. была анімалістыка. Сярод шматлікіх выяў свойскіх і дзікіх жывёл, птушак, рыб можна вылучыць два падыходы да іх адлюстравання. Першы — рэалістычны, у якім прасочваецца развіццё і станаўленне стылю ад першых натуралістычных адбіткаў з жывых ракаў і рыб, дзе майстар нібы яшчэ прыстасоўваўся да перадачы анімалістыкі — вывучаў пластыку, мову, тэхналогію, да выяў, зробленых прафесіянальна, з высокім майстэрствам, адчуваннем малюнка і характару жывёл.

Другі падыход характарызуецца адцягненай трактоўкай вобразаў. Выявы жывёл выкарыстоўваюцца для алегарычнай, іншамоўнай перадачы зместу згодна з характарам жывёлы. Яны надзяляюцца сімваламі, напрыклад, леў паўстае ў выглядзе драпежніка, уладара, пераможца, а арол асэнсоўваецца з цэнтралізацыяй улады, гонару, сілы. Коні, сабакі, ваўкі, шакалы, лісы, малпы, цмокі, вялікае мноства іншых выяў жывёл выкарыстоўваліся для перадачы патрэбнага зместу. Вельмі часта майстар, які ніколі не бачыў драпежных або фантастычных жывёл, такіх, як леў, шакал, арол, грыфон, цмок, маляваў іх па-свойму. У выніку з'яўляліся фантастычныя выявы, дзе ў звычайнага сабакі адрасталі непамерныя кіпцюры, зубы, маляваліся крылы, тулава гуся прыстасоўвалася да арлінай галавы. Ёсць зусім неверагодныя, незразумелыя выявы. Такая трактоўка анімалістычных выяў часцей за ўсё выкарыстоўвалася ў геральдыцы.

У беларускім кафлярстве з XVI ст. маюцца розныя варыянты выявы святога Юрыя (Георгія)-Пераможцы. Найбольш раннія кафлі з гэтым малюнкам знойдзены на тэрыторыі Мірскага замка і датуюцца другой паловай XVI ст. Фігура вершніка і асабліва каня пададзена ў познерэнесансных (маньерыстычных) традыцыях.

Кафлі з Магілёва і Мсціслава (першая палова — сярэдзіна XVII ст.) вылучаюцца барокавай трактоўкай сюжэту. Найбольш арыгінальная мсціслаўская кафля. Выява асілка на кані, які дзідай забівае цмока і вызваляе з палону прыгажуню-царэўну, мае непасрэдныя аналагі ў беларускім жывапісе XVIII ст. і народнай батлейцы XIX ст. Гэты сюжэт вядомы толькі з раскопак у Тупічэўскім манастыры. Гэта непаліваная кафля, вонкавая пласціна якой зроблена ў драўлянай форме. Яе памер 23x18,5 см.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэтай кафляй была аблямавана цэлая печ і таму вядомы беларускі мастак-кераміст і рэстаўратар Уладзімір Угрыновіч здолеў аднавіць некалькі цэлых экзэмпляраў вышэйзгаданай кафлі. Зараз яна знаходзіцца ў экспазіцыях розных беларускіх музеяў, у тым ліку і ў мсціслаўскім гісторыка-археалагічным музеі.

Трэба адзначыць, што сюжэтная кафля з Тупічэўскага манастыра ў Мсціславе пакуль што адзіная па сваім сюжэце сярод усёй беларускай кафлі і несумненна з'яўляецца ўнікальным узорам беларускага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва XVII ст.













Выданні аб старажытнай Мсціслаўшчыне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ